**Шэдзько, А**. Памяць баявой маладосці / А. Шэдзько // Герой працы (Шуміліна). — 2008. — 15 лют. — С. 2.

## ПАМЯЦЬ БАЯВОЙ МАЛАДОСЦІ



Рабочы Обальскага керамічнага завода Валерый Уладзіміравіч Ішчук не любіць успамінаць пра Афганістан.

– Нічога звышгераічнага там не было, – расказвае ён, – вайна, кроў, смерць...

Сам з Віцебскага раёна, у 1979 годзе прызвалі на тэрміновую вайсковую службу, трапіў у Рыгу ў артылерыйскія войскі. Пасля двух месяцаў вучэбкі ў Калінінградзе В. У. Ішчука накіроўваюць у Тэрмес, на таджыкскую мяжу. Менавіта там і фарміравалі баявую часць для адпраўкі ў Афганістан. «Напісаў рапарт, каб дабравольцам пайсці ў Афганістан, – успамінае мужчына, – можна сказаць, паклікала ваенная рамантыка. Тым больш, што і ўсе мае сябры таксама напісалі заявы. У маладосці не задумваешся пра рызыку». Разам з Валерыем яшчэ 10 беларусаў трапілі ў баявую часць.

Уразіў маладога салдата Кабул сваёй непаўторнасцю і прыгажосцю. «Мірны горад, сапраўдная мека для турыстаў, – успамінае ён, – мячэці, азіяцкая культура, мусульманскія традыцыі – усё новае, невядомае для нас, славян. І горы, якія немагчыма апісаць, іх трэба бачыць...». І разам з гэтым, узгадвае В. У. Ішчук, жаданне паваяваць, здзейсніць подзвіг.

Але рамантыка знікла хутка: баявое хрышчэнне В. У. Ішчук атрымаў пры першым жа пералёце з Кабула ў Джэлалабад. «Нашу мінную батарэю абстралялі маджахеды, – успамінае Валерый, – але я яшчэ цалкам не асэнсоўваў усю небяспеку. Цвярозае асэнсаванне прыйшло пазней, калі ўбачыў першую смерць свайго сябра...».

Джэлалабад знаходзіцца блізка ад мяжы з Пакістанам, і баявыя аперацыіміннай батарэі, у якой служыў В. У. Ішчук, былі штодзённымі. Гэта цяжка зразумець, калі днём афганцы – мірныя ды сяброўскія, якія ўсміхаюцца табе, а ноччу ў гэтага «сябра» ў руках з’яўляецца зброя... «З кожным днём станавілася ўсё больш страшна, – кажа воін-інтэрнацыяналіст, – смерць хадзіла па пятах. Да гэтага немагчыма прызвычаіцца... Дзень за днём – смерць за смерцю...».

Асабліва цяжкім выдаўся май 1981 года. «Чым бліжэй дэмабілізацыя, тым больш было страшна за сваё жыццё», – прызнаецца В. У. Ішчук.

13 мая 1981 года групу салдат сярод, якіх быў і Валерый, з Джэлалабада даставілі ў Ашхабад. Праўда, перад гэтым 8 мая была апошняя баявая аперацыя, на якую ён ішоў з галоўным для сябе заданнем: выжыць.

Але Афганістан яшчэ доўга даваў пра сябе знаць начнымі кашмарамі, цяжкімі ўспамінамі. Ад усяго гэтага ён знайшоў паратунак у сям’і.

Не часта гаворыць пра Афганістан В. У. Ішчук, хаця часам дзеці (а іх у яго трое) і распытваюць бацьку пра баявую маладосць. Валерый Уладзіміравіч упэўнены:

– Дзякуй богу, што мае дзеці не будуць служыць у гарачых кропках. У нас ёсць свая краіна, наша Беларусь – мірная і без войнаў.

**А. Шэдзько**